# Гарышча

***Уладзімер Арлоў***

*Гарышча* — слова, настоенае на таямніцах.
На *гарышчы* жывуць кажаны і ажываюць казкі.
*Гарышча* вабіць бабуліным калаўротам і дзедавай шабляй.
*Гарышча* страшыць затканымі павучынай кроснамі, за якімі ўдзень сьпіць Дамавік.
*Гарышча* ўсьцешвае старымі беларускімі кніжкамі і календарамі.
У Шчодры вечар дзяўчаты выглядваюць на *гарышчы* ў люстэрку свайго нарачонага.
На *гарышчы* рэдка прызначаюць спатканьні.
*Гарышча* любяць шпіёны і самагубцы.
*Гарышча* палохае, але гарышча й ратуе.
На *гарышчы* хаваюць забароненую літаратуру.
На *гарышчы* хаваюцца тыя, што ідуць супроць улады.
З *гарышча* выходзіць зь бел-чырвона-белым сьцягам на дах легендарны Мірон.
*Гарышча* — неадменная частка нацыянальнае сьветабудовы.
*Гарышча* лучыць беларусаў з космасам.
Мы жывем у хаце,
над намі жыве *гарышча*,
над *гарышчам* — неба.

# Гарэлка

***Віталь Цыганкоў***

Што трэба, каб пасадзіць соткі, прывезьці сена, насекчы дроваў, адрамантаваць кран, здабыць вядро цэмэнту? Грошы не дапамагаюць, ратуе пляшка *гарэлкі*. *Гарэлка* прайшла, прамаршавала праз усё XX стагодзьдзе ня проста як алькагольны напой, а як усеагульны эквівалент грошай у краіне, дзе тавараабменныя апэрацыі панавалі задоўга да зьяўленьня слова „бартэр“.

Хто асьмеліцца спрачацца, што *гарэлка* — ня слова стагодзьдзя? Што б ні дзеялася, што б ні здаралася, а мы „па чарачцы, ды па малюсенькай...“.

*Гарэлка* ўлілася ў беларускую мову ўдала, як у кілішак. Вымавіце „віно“ альбо „шампанскае“, ня кажучы ўжо пра розныя там віскі, ромы і лікёры — адразу адчуваецца нешта чужароднае, халоднае. Іншая справа — *гарэлка*! Адно гучаньне гэтага слова прымушае каго ўсьміхнуцца, каго нэрвова сьцепануцца, каго заплакаць.

Народ заўсёды ставіўся да *гарэлкі* сур'ёзна, нават з залішняй павагай, як да прыкметы дабрабыту. Ладны стол мусіць быць укаранаваны пляшкай. Або цэлым гусаком. *„Калі піць, дык ня кпіць“*. *„Паставіўшы талеркі, нап'емся гарэлкі“*. *„Гарэлка ня дзеўка, не цалуй“*. Ну і сучасны варыянт: *„Каб была чарка і скварка“*. А зрэшты, пра што яшчэ марыць у краіне, дзе кіляграм мяса каштуе, як чатыры бутэлькі *гарэлкі*? Нездарма кажуць — *„ад гарэлкі розум мелкі“*. Але *гары яно гарам...*

*„Ад панядзелка да панядзелка дробны дождж ідзе, сабралася бедна басота ды гарэлку п'е“*.